Самолет ТУ-154 М, отправившись в свой первый рейс со 164 пассажирами на борту, преодолел расстояние в 2114 километров за три часа десять минут. Стоимость билета — 287 долларов, или 313 рублей.

Рейс Иркутск—Шеньян выполняет Восточносибирское управление гражданской авиации, отмечающее в эти дни свое 65-летие и преобразованное сейчас в объединение «Байкалавиа». В 1956 году именно иркутские авиаторы начинали регулярные полеты в Китай, которые в 60-х годах были прерваны.

ВОЗМОЖНА ЛИ СУПЕРПАРТИЯ!

«Создаваемому ныне «Движению за демократические реформы» едва ли удастся включить в себя весь спектр демократических сил, — рассказал один из лидеров «Демроссии» Владимир Боксер.—Это движение, формирующееся «сверху», не может рассчитывать на серьезную вертикальную структуру в обществе, без которой невозможны ни организация партии, ни победа на выборах». По его словам, прошедший недавно пленум Совета представителей «Демроссии» показал, что ее провинциальные структуры в массе своей не станут основой новой партии. Активисты среднего звена, которые в значительной степени и определяют ход политического процесса, уже задействованы в организациях «Демроссии», хотя, возможно, и будут оказывать новой партии какую-то помощь. «Я думаю, — сказал также В. Боксер, — что «движение» заполнит собой политическое пространство между Горбачевым и Ельциным и будет союзником тех сил, что останутся слева от Президента России.

ПОЖАР В «АСТОРИИ»

Вчера в 11.30 утра в ленинградское управление пожарной охраны поступил сигнал о пожаре в отеле «Астория».

Огонь вспыхнул в подвале, где находится установка системы пылоудаления отеля, — горело оборудование в помещении размерами 12×2 и 12×3 метра.

В тушении пожара участвовало 80 пожарных. Их работа затруднялась большим количеством едкого дыма, выделявшегося при горении пластиковых составляющих звукоизоляции и оборудования. Причина возгорания — скорее всего, электрооборудование, возможно, электромотор системы пылоудаления.

Пожар был ликвидирован в 13.49.

Отель «Астория» реконструировала финская фирма «Юит Хтюмя», и ввод в эксплуатацию состоялся вместо мая в июне, так как пожарная инспекция, наученная горьким опытом недавней трагедии в отеле «Ленинград», очень придирчиво принимала противопожарные системы «Астории». Во время пожара отелю практически не был причинен ущерб. Его постояльцы не испытали никаких неудобств или беспокойства.

(Инфоновости).

ДЗЯРЖАЎНАЯ ПРАГРАМА БЕЛАРУСКАЙ ССР ПА СТАБІЛІЗАЦЫІ ЭКАНОМІКІ І САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ НАСЕЛЬНІЦТВА

ЭКАНАМІЧНАЯ СІТУАЦЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

Эканамічная і палітычная сітуацыя ў рэспубліцы імкліва абвастраецца. З пачатку бягучага года яна набыла ярка выяўлены крызісны характар. Непаслядоўныя дзеянні цэнтра прыводзяць да велізарнага бюджэтнага дэфіцыту, развалу фінансавай і крэдытна-грашовай сістэмы, разбурэння спажывецкага рынку. Да ўсплеску адкрыта выяўленай незадаволенасці ў грамадстве прывяла праведзеная саюзным урадам непрадуманая рэформа рознічных цэн.

У сілу рэзкага падзення вытворчасці ў паліўна-энергетычным, металургічным і хімікалясным комплексах краіны пастаўкі ў рэспубліку жыццёва важных відаў сыравіны, матэрыялаў і камплектуючых вырабаў могуць скараціцца ў бягучым годзе на 25—30 працэнтаў, што, калі не супрацьпаставіць эфектыўныя меры надзвычайнага характару, выкліча глыбокія негатыўныя змяненні ў эканоміцы, далейшы спад вытворчасці і яшчэ большае зніжэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва.

Вярхоўны Савет і урад рэспублікі прадпрымаюць усё, што ад іх залежыць, па паляпшэнню становішча спраў у эканоміцы і сацыяльнай абароне насельніцтва. Аднак, улічваючы складанасць абстаноўкі, неабходны дадатковыя неардынарныя практычныя дзеянні, якія былі б падтрыманы ўсім грамадствам.

Нарастанне крызісных з'яў патрабуе вырашыць у бліжэйшы перыяд наступныя неадкладныя задачы:

забяспечыць паслядоўнае выкананне праграмы пераходу рэспублікі да рынкавай эканомікі, удзяліўшы асаблівую ўвагу развіццю дзелавой актыўнасці і свабоднага прадпрымальніцтва;

прадухіліць разбурэнне эканомікі рэспублікі, далейшы спад вытворчасці ў жыццезабяспечваючых галінах;

сумеснымі намаганнямі рэспублік і цэнтра не дапусціць некіруемай інфляцыі і развалу грашовага абароту;

спыніць падзенне жыццёвага ўзроўню народа, нармалізаваць забеспячэнне насельніцтва харчаваннем, медыкаментамі, таварамі першай неабходнасці.

ПЕРШАЧАРГОВЫЯ МЕРЫ ПА ПАСКАРЭННЮ ПЕРАХОДУ ДА РЫНАЧНЫХ АДНОСІН

Стратэгічным напрамкам застаецца фарміраванне эфектыўнай сацыяльна-арыентаванай рыначнай эканомікі на аснове рэспубліканскай праграмы пераходу да рынку. Паскарэнне працэсу фарміравання рыначных адносін дазволіць даць штуршок прадпрымальніцкай і дзелавой актыўнасці, стварыць умовы для аздараўлення фінансаў, структурнай перабудовы і прыцягнення замежных інвестыцый, што з'явіцца таксама важнейшым стабілізуючым фактарам.

У гэтых мэтах неабходна да 1 верасня 1991 года ўнесці ў Грамадзянскі і Крымінальны кодэксы БССР змяненні, якія ліквідуюць перашкоды на шляху прадпрымальніцтва, распрацаваць і прыняць звязаныя з гэтым асноўныя законы, перш за ўсё аб гаспадарчых суполках і таварыствах, аб акцыянерных таварыствах і таварыствах з абмежаванай адказнасцю, аб супрацьдзеянні манапалістычнай дзейнасці, аб прыватызацыі.

Увесці спрошчаны парадак выезду за мяжу грамадзян рэспублікі ў мэтах абучэння прадпрымальніцтву, наладжвання ўстойлівых сувязей з дзелавымі коламі іншых краін.

У III квартале бягучага года распрацаваць рэспубліканскую праграму раздзяржаўлення і прыватызацыі і прыступіць да яе рэалізацыі.

Размежаванні кампетэнцыі ў працэсе раздзяржаўлення і прыватызацыі паміж органамі ўлады і кіравання рэспублікі і Саюза ССР ажыццяўляць на аснове артыкула 10 Закона БССР аб народаўладдзі, забяспечыўшы пераход пад юрысдыкцыю рэспублікі прадпрыемстваў усіх галін народнай гаспадаркі, якія знаходзяцца ў гэты час у саюзным падпарадкаванні.

Савету Міністраў БССР, мясцовым Саветам правесці да 1 кастрычніка 1991 года размежаванне камунальнай уласнасці па ўзроўнях тэрытарыяльнага кіравання.

У першачарговым парадку прыступіць да прыватызацыі ў гандлі, грамадскім харчаванні, бытавым абслугоўванні, аўтасэрвісе невялікіх прадпрыемстваў транспарту, прамысловасці і іншых галін народнай гаспадаркі, дзе недзяржаўныя структуры найбольш эфектыўныя.

Стымуляваць продаж здадзеных у арэнду дзяржаўных памяшканняў.

Забяспечыць фарміраванне фінансавага рынку на аснове камерцыялізацыі крэдытных устаноў, стварэння фондавай біржы і сеткі аўдытарскіх і брокерскіх фірм, арганізацыі выпуску каштоўных папер.

Прыступіць да фарміравання інфраструктуры таварнага рынку, забяспечыць легалізацыю і прававую абарону пасрэдніцкай дзейнасці.

Распрацаваць і зацвердзіць праграму падрыхтоўкі кадраў у галіне прадпрымальніцтва, фінансавага і таварнага рынкаў.

Умацаваць юрыдычныя службы для кваліфікаванага вырашэння пытанняў развіцця прадпрымальніцтва і функцыяніравання рыначных структур.

З мэтай стварэння рынку жылля неадкладна прыступіць да яго прыватызацыі на добраахвотнай і пераважна бязвыплатнай аснове (у межах устаноўленых норм), выпрацоўкі льготных умоў для набыцця жылля малазабяспечанымі сем'ямі. Павысіць кватплату за лішкі жылой плошчы звыш нормы да 10-кратнага размеру, за выключэннем жылога фонду ў сельскай мясцовасці. Стварыць зоны індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва з выдзяленнем усім жадаючым участкаў пад забудову.

НЕАДКЛАДНЫЯ МЕРЫ ПА СТАБІЛІЗАЦЫІ ЭКАНОМІКІ

У ГАЛІНЕ ФІНАНСАЎ І БЮДЖЭТУ

Сацыяльна-эканамічная абстаноўка, якая склалася ў рэспубліцы, патрабуе значнага павелічэння расходаў Дзяржаўнага бюджэту Беларускай ССР на 1991 год. Звыш прадугледжаных у ім сум, з улікам мерапрыемстваў па сацыяльнай абароне насельніцтва ў сувязі з увядзеннем з 2 красавіка бягучага года новых рознічных цэн дадаткова, акрамя ўласных сродкаў прадпрыемстваў, спатрэбіцца каля 2,7 млрд. рублёў. Гэта значыць, што да канца года, калі не прыняць неабходных мер, дэфіцыт бюджэту можа перавысіць 6 млрд. рублёў.

У гэтых умовах неабходны самы жорсткі рэжым эканоміі фінансавых рэсурсаў, пошук і рэалізацыя магчымасцей зніжэння бюджэтнага дэфіцыту за кошт умацавання даходных крыніц, скарачэння расходаў, якія не маюць першачарговага значэння, удасканалення парадку перадачы фінансавых рэсурсаў у саюзны бюджэт, паслядоўнай рэалізацыі прынцыпу «жыць—па сродках».

ПА ЎЗАЕМААДНОСІНАХ З САЮЗНЫМ БЮДЖЭТАМ

Пытанне аб перадачы на саюзныя патрэбы сродкаў, прадугледжаных эканамічным пагадненнем аб рэформе рознічных цэн, падлягае ўдакладненню з улікам рэальных паступленняў у бюджэт рэспублікі, неабходнасці павелічэння асігнаванняў на ліквідацыю вынікаў чарнобыльскай катастрофы, а таксама прынятых саюзнымі і рэспубліканскімі органамі рашэнняў па сацыяльнай абароне насельніцтва. Савету Міністраў БССР дадаткова прапрацаваць яго ў саюзных органах, маючы на ўвазе максімальнае памяншэнне сумы, якая падлягае перадачы.

У мэтах змянення ўказанняў саюзных органаў устанавіць, што ўся сума ад дааценкі рэшткаў тавараў, на якія з 2 красавіка 1991 года ўведзены новыя рознічныя цэны, застаецца ў распараджэнні рэспублікі і размяркоўваецца наступным чынам: ад дааценкі рэшткаў тавараў у межах нарматыву яна накіроўваецца на павелічэнне нарматыву і статутнага фонду аб'яднанняў, прадпрыемстваў і арганізацый, а частка, якая засталася, — роўнымі долямі ў даходы рэспубліканскага бюджэту і бюджэтаў адпаведных абласцей і г. Мінска.

Устанавіць, што ў 1991 годзе ў саюзны бюджэт перадаецца 17 працэнтаў прыбытку прадпрыемстваў саюзнага і рэспубліканскага падпарадкавання, але не больш 2,4 млрд. рублёў, як гэта ўлічана ў разліках да бюджэту. Міністэрству фінансаў БССР вызначыць парадак паступлення ў бюджэт рэспублікі часткі плацяжоў звыш указанай сумы.

Увайсці ў Савет Федэрацыі з прапановай аб стварэнні спецыяльнага органа па кантролю за фарміраваннем і выкарыстаннем сродкаў саюзнага бюджэту з абавязковым прадстаўніцтвам ад кожнай рэспублікі.

ПА ЎЗАЕМААДНОСІНАХ З БЮДЖЭТАМІ АБЛАСЦЕЙ І Г. МІНСКА

Савету Міністраў БССР сумесна з аблвыканкомамі, Мінскім гарвыканкомам удакладніць даходы і расходы бюджэтаў абласцей і г. Мінска ў сувязі з прынятымі рашэннямі па змяненню рознічных цэн і сацыяльнай абароне насельніцтва, надзвычайнымі мерамі па выкананню бюджэту на другое паўгоддзе 1991 года.

Аднесці павелічэнне бюджэтнага дэфіцыту поўнасцю на рэспубліканскі бюджэт, захаваўшы дэфіцыты па бюджэтах абласцей і г. Мінска ў ранейшых аб'ёмах.

Перайсці з 1992 года на фарміраванне мясцовых бюджэтаў на аснове нарматываў бюджэтнай забяспечанасці, прадугледзеўшы дыферэнцыраваны падыход да ўстанаўлення размераў адлічэнняў ад агульнарэспубліканскіх даходаў і падаткаў у бюджэты тых рэгіёнаў, уласная даходная база якіх недастатковая для пакрыцця расходаў. Савету Міністраў БССР унесці ў Вярхоўны Савет прапановы па гэтаму пытанню да 1 верасня 1991 года.

Павялічыць з другога паўгоддзя бягучага года нарматыў адлічэнняў падатку з продажу ў бюджэты абласцей і г. Мінска з 20 да 35 працэнтаў за кошт адпаведнага памяншэння размеру адлічэнняў у рэспубліканскі бюджэт.

У выпадку выдання заканадаўчых актаў і рашэнняў урада БССР, якія выклікаюць павелічэнне расходаў або памяншэнне даходаў бюджэтаў абласцей і г. Мінска, гэтым бюджэтам кампенсуюцца сродкі з рэспубліканскага бюджэту. У выпадку прыняцця мясцовымі Саветамі рашэнняў, якія выклікаюць памяншэнне плацяжоў у рэспубліканскі бюджэт, пакрыццё страт праводзіцца за кошт адпаведных мясцовых бюджэтаў.

ПА ПРЫЦЯГНЕННЮ Ў БЮДЖЭТ ДАДАТКОВЫХ КРЫНІЦ І ЎЗМАЦНЕННЮ ЖОРСТКАСЦІ РАСХОДАЎ ДЗЯРЖАЎНЫХ СРОДКАЎ

Прыняць надзвычайныя меры па выкананню Дзяржаўнага бюджэту рэспублікі на 1991 год і даручыць Савету Міністраў БССР у працэсе іх рэалізацыі ажыццяўляць іншыя меры па скарачэнню бюджэтнага дэфіцыту.

У сувязі з узрастаючым дэфіцытам бюджэту і вострай неабходнасцю ажыццяўлення мерапрыемстваў, якія выклікаюць дадатковыя расходы, правесці перагаворы з замежнымі краінамі аб выдзяленні крэдытаў для павышэння тэхнічнага ўзроўню прадпрыемстваў аграпрамысловага комплексу, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, а таксама стварэння ўмоў для выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі.

Устанавіць парадак, пры якім прадукцыя, што пастаўляецца за межы рэспублікі звыш аб'ёмаў дзяржаўнага заказу, рэалізуецца па цэнах вышэй унутрырэспубліканскіх не менш чым на 20 працэнтаў, з накіраваннем 50 працэнтаў дадатковай выручкі ў даход бюджэту.

Распрацаваць і прыняць да 1 кастрычніка 1991 года законы аб рэформе сістэмы падаткаабкладання з улікам асаблівасцей рэспублікі, яе дзяржаўнага суверэнітэту і пераходу да рынку.

Мясцовым Саветам народных дэпутатаў больш поўна выкарыстоўваць прадастаўленыя ім правы ў частцы ўстанаўлення мясцовых падаткаў і збораў з выкарыстаннем атрыманых сродкаў на сацыяльна-эканамічнае развіццё тэрыторыі.

Арганізаваць у 1991 годзе ў рэспубліцы рэалізацыю праз аўкцыёны часткі выдзеленых па рыначных фондах імпартных мэблевых гарнітураў, тэлевізараў, магнітафонаў, відэамагнітафонаў, халадзільнікаў, а таксама складанай бытавой тэхнікі і тэлерадыёапаратуры айчыннай вытворчасці апошніх мадыфікацый. Дзяржэканомплану, Мінгандлю, Мінфіну БССР сумесна з абласнымі і Мінскім гарадскім Саветамі вызначыць пералік і долю тавараў, дазволеных для рэалізацыі на аўкцыёнах. Устанавіць, што 80 працэнтаў атрыманай у сувязі з гэтым дадатковай выручкі паступае роўнымі долямі ў рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты. Правам на набыццё тавараў на аўкцыёнах карыстаюцца толькі грамадзяне, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Беларускай ССР. Указаная прадукцыя рэалізуецца за межы рэспублікі па дагаворных цэнах не ніжэй за цэны, якія складваюцца пры аўкцыённым продажы, з залічэннем розніцы ў бюджэт у аналагічным, як для аўкцыёнаў, парадку.

Аднавіць камерцыйны гандаль віна-гарэлачнымі і тытунёвымі вырабамі, перш за ўсё імпартнай вытворчасці. Вызначыць пералік віна-гарэлачных і тытунёвых вырабаў, якія рэалізуюцца па камерцыйных цэнах, выключыць рэалізацыю вырабаў аналагічнага асартыменту праз звычайную гандлёвую сетку.

Арганізаваць у 1991 годзе выпуск рэспубліканскіх мэтавых беспрацэнтных пазык на суму да 100 млн. рублёў з пагашэннем аблігацый пазыкі вострадэфіцытнымі таварамі.

Максімальна абмежаваць выдзяленне з бюджэту міністэрствам і ведамствам Беларускай ССР, прадпрыемствам, установам і арганізацыям дадатковых асігнаванняў. Да стабілізацыі фінансавага становішча рэспублікі не прымаць новых рашэнняў, якія выклікаюць павелічэнне расходаў бюджэту.

Перагледзець пералік аб'ектаў, якія фінансуюцца за кошт бюджэтных асігнаванняў, закрыць фінансаванне тых з іх, будаўніцтва якіх не пачата і не выклікаецца першачарговай неабходнасцю.

Увесці на тэрыторыі рэспублікі на 1991—1992 гады плату па прыпыненых і закансерваваных будоўлях і аб'ектах з разліку 10 працэнтаў вартасці незавершанага будаўніцтва, забяспечыўшы дыферэнцыраваны падыход з улікам прычын і адказнасці бакоў. Распаўсюдзіць парадак спагнання такой платы на звышнарматыўныя аб'ёмы незавершанага будаўніцтва ў іншых аб'ектах.

Правесці да 1 ліпеня бягучага года інвентарызацыю закансерваваных, прыпыненых будоўляў і аб'ектаў [illegible] і плошчаў, якія не выкарыстоўваюцца, і пачаць іх [illegible]жу. Сродкі ад продажу аб'ектаў, будаўніцтва якіх ажыццяўлялася за кошт бюджэтных асігнаванняў, цэнтралізаваных фондаў і рэзерваў міністэрстваў і ведамстваў БССР, пералічваюцца ў размеры 75 працэнтаў у даход бюджэту рэспублікі і 25 працэнтаў застаюцца ў распараджэнні заказчыка.

Прыняць [illegible] урадам [illegible] колькасць [illegible] цэнтральнага апарату міністэрстваў і ведамстваў Беларускай ССР на 25 [illegible] ваць са[illegible] калектыва[illegible] нанняў, [illegible] арганізацый [illegible] 30 працэнтаў [illegible] адміністрацыйна-[illegible] апарату з накіраваннем сродкаў, якія вызваляюцца, на рэалізацыю сацыяльных праграм.

Рэкамендаваць [illegible] раённым [illegible] абласнога [illegible] колькасці [illegible] 70 тыс. [illegible] народных [illegible] адзіныя [illegible] кошт аб[illegible] раённых [illegible] агульны [illegible] цэнтр, з [illegible] адміністрацыйна-тэрытарыяльных [illegible] ваннем [illegible] Саветаў [illegible] ным га[illegible] таксама [illegible] лікіх па[illegible] тва сельскіх Саветаў.

Прызнаць неабходным паменшыць размер адлічваемых прадпрыемствамі і арганізацыямі сродкаў на дарожныя работы з 1 да 0,5 працэнта. У сувязі з гэтым у ходзе выканання бюджэту адшукаць магчымасць выдзялення сродкаў, якіх нестае, на выкананне запланаваных аб'ёмаў работ па будаўніцтву і рамонту аўтамабільных дарог рэспублікі.

У мэтах стварэння дадатковых крыніц для забеспячэння кампенсацыйных выплат работнікам прадпрыемстваў і арганізацый незалежна ад форм уласнасці знізіць з II квартала бягучага года стаўку падаткаабкладання прыбытку з 45 да 35 працэнтаў.

Намечаныя меры дазволяць звесці дэфіцыт бюджэту да канца бягучага года да 5 млрд. рублёў, для пакрыцця якога ўрад вымушаны будзе прыцягваць за адпаведную плату крэдытныя рэсурсы Нацыянальнага банка БССР.

У ГАЛІНЕ БАНКАЎСКАЙ І ГРАШОВА-КРЭДЫТНАЙ СІСТЭМЫ

Нацыянальнаму банку БССР сумесна з Саветам Міністраў БССР вызначыць на другое паўгоддзе 1991 года асноўныя напрамкі ўдасканалення грашова-крэдытных адносін у народнай гаспадарцы рэспублікі. У гэтых мэтах праводзіць самастойную палітыку ў галіне ўстанаўлення ўліковых ставак, норм абавязковых рэзерваў, якія размяшчаюцца камерцыйнымі банкамі ў Нацыянальным банку БССР, узроўню працэнтаў за крэдыт, што прадастаўляецца прадпрыемствам і арганізацыям.

Нацыянальнаму банку БССР пры рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі ў другім паўгоддзі 1991 года прадугледзець прыярытэт у выкарыстанні цэнтралізаваных крэдытных рэсурсаў у першую чаргу на фінансаванне мерапрыемстваў, звязаных з павелічэннем вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі і тавараў народнага спажывання.

Дазволіць камерцыйным банкам рэспублікі рэзерваванне сродкаў у Нацыянальным банку БССР у межах устаноўленых нарматываў ажыццяўляць у выглядзе дзяржаўных каштоўных папер, якія выпускаюцца Міністэрствам фінансаў БССР на пакрыццё бюджэтнага дэфіцыту.

З 1 студзеня 1992 года змяніць дзеючы парадак разлікаў і пакрыцця розніц у цэнах на сельскагаспадарчую і іншую прадукцыю, маючы на ўвазе рабіць выплаты розніц у цэнах па месцы яе спажывання за кошт сродкаў адпаведных бюджэтаў.

З мэтай паляпшэння крэдытна-разліковага абслугоўвання прадпрыемстваў і арганізацый па экспартна-імпартных аперацыях і арганізацыі валютнага абслугоўвання грамадзян утварыць да 1 жніўня 1991 года акцыянерны камерцыйны Банк знешнеэканамічнай дзейнасці Беларускай ССР.

У ГАЛІНЕ ЦЭНААЎТВАРЭННЯ

Да канца бягучага года не дапускаць перавышэння дзеючага ўзроўню дзяржаўных рознічных цэн на асноўныя харчовыя і нехарчовыя тавары, якія ўваходзяць у спажывецкі кошык, і тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі.

Далейшую лібералізацыю цэн праводзіць па меры фарміравання рынкава-арыентаваных сектараў эканомікі, раздзяржаўлення, прыватызацыі і дэманапалізацыі ў сферы вытворчасці, гандлю і паслуг.

Дазволіць прадпрыемствам, аб'яднанням і арганізацыям рэалізоўваць прадукцыю вытворча-тэхнічнага прызначэння па дагаворных цэнах замест фіксаваных у выпадках, калі на яе выраб выкарыстоўваліся сыравіна, матэрыялы і камплектуючыя вырабы, набытыя па дагаворных цэнах.

У мэтах абмежавання манапольнага дыктату вытворцаў прадукцыі прадаставіць правы Дзяржэканомплану БССР у перыяд рэалізацыі надзвычайных мер:

адмяняць эканамічна неабгрунтаваныя дзяржаўныя фіксаваныя і рэгулюемыя цэны і па меры стабілізацыі спажывецкага рынку зніжаць іх узровень;

накладаць на службовых асоб, вінаватых у парушэнні дысцыпліны дзяржаўных фіксаваных і рэгулюемых цэн, штрафы ў размеры да месячнага акладу.

У ГАЛІНЕ РЭСУРСНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ

Забяспечыць прыярытэтны напрамак матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў на патрэбы аграпрамысловага комплексу, будаўніцтва аб'ектаў, звязаных з ліквідацыяй вынікаў чарнобыльскай катастрофы, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, па выпуску тавараў народнага спажывання.

З мэтай дадатковага ўцягнення ў гаспадарчы абарот матэрыяльных рэсурсаў завяршыць поўны перапіс рэшткаў вытворчых і складскіх запасаў матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў і неўстаноўленага абсталявання на прадпрыемствах, а таксама ў сістэме матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і на яе аснове арганізаваць пачынаючы з III квартала 1991 года шырокую распрадажу рэсурсаў, якія не выкарыстоўваюцца, у тым ліку праз таварныя біржы.

Для ажыццяўлення аператыўнага пераразмеркавання матэрыяльных рэсурсаў, уключаючы змяншэнне паставак за межы рэспублікі, забеспячэння пры гэтым абароны інтарэсаў прадпрыемстваў і арганізацый прадаставіць адпаведныя правы Дзяржэканомплану, Дзяржзабеспячэнню, Вышэйшаму Гаспадарчаму Суду БССР і банкам БССР.

У выпадку непаставак па ўнутрырэспубліканскіх планах па ўзгадненню з Вышэйшым Гаспадарчым Судом БССР прадугледзець штрафныя санкцыі ў размеры 100 працэнтаў вартасці недапастаўленай прадукцыі.

Прамысловым прадпрыемствам рэспублікі забяспечыць першачарговую і (пры згодзе атрымальніка) датэрміновую пастаўку прадукцыі па фондах для рэспубліканскіх спажыўцоў.

Пры шматразовых парушэннях аб'ёмаў і тэрмінаў паставак сыравіны і прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння па выдзеленых лімітах і заключаных міжурадавых пагадненнях з боку прадпрыемстваў і арганізацый іншых рэспублік скарачаць або спыняць вываз прадукцыі ў гэтыя рэгіёны, а рэсурсы, што вызваляюцца, накіроўваць для больш поўнага забеспячэння патрэб Беларускай ССР.

Устанавіць на 1992 год парадак, пры якім для прадпрыемстваў усіх форм уласнасці і відаў падпарадкаванасці ўводзіцца адзіны рэспубліканскі дзяржзаказ, што ўключае пастаўкі прадукцыі для патрэб рэспублікі, у тым ліку па заказах аблвыканкомаў (Мінскага гарвыканкома), Саюза і рэалізацыі міжрэспубліканскіх пагадненняў.

У III квартале бягучага года вызначыць аб'ёмы ўзаемных міжрэспубліканскіх паставак, перазаключыўшы міжурадавыя пагадненні, тэрмін якіх заканчваецца ў 1991 годзе.

Прыступіць пачынаючы з 1992 года да стварэння сумесных прадпрыемстваў, цэхаў і вытворчых магутнасцей з іншымі рэспублікамі на кампенсацыйнай аснове.

Завяршыць да 1 ліпеня бягучага года распрацоўку абласных балансаў вытворчасці і спажывання, увозу і вывазу сыравіны, прадукцыі і тавараў як асновы для фарміравання планаў на 1992 год.

На аснове ўказаных балансаў перагледзець структуру вытворчасці, скараціць выпуск прадукцыі, якая падлягае вывазу з рэспублікі, і павялічыць вытворчасць прадукцыі, якой не хапае.

У мэтах забеспячэння ўстойлівай работы аб'ектаў паліўна-энергетычнага і транспартнага комплексаў увесці асобы рэжым іх функцыяніравання, які гарантуе надзейную абарону прадпрыемстваў зазначаных галін.

Забяспечыць апераджальнае будаўніцтва Мінскіх ЦЭЦ-4 і ЦЭЦ-5, Гомельскай ЦЭЦ-2, лініі электраперадачы Смаленская АЭС — падстанцыя «Беларуская», газапровадаў-адводаў, аўтамабільных газанапаўняльных кампрэсарных станцый і іншых аб'ектаў паліўна-энергетычнага комплексу.

Павялічыць пастаўкі газавага паліва ў сельскія раёны, у тым ліку забруджаныя радыенуклідамі, не менш чым у 2,5 — 3 разы.

НЕАДКЛАДНЫЯ МЕРЫ ПА САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ НАСЕЛЬНІЦТВА І ЎДАСКАНАЛЕННЮ ПРАЦОЎНЫХ АДНОСІН

Дзяржкампрацы БССР, кіраўнікам прадпрыемстваў да 1 чэрвеня 1991 года перагледзець тарыфныя стаўкі і службовыя аклады з налічэннем на іх прадугледжаных дзеючым заканадаўствам ільгот і кампенсацый, надбавак і даплат, прэмій і ўзнагароджанняў стымулюючага парадку. Забяспечыць у 1992 годзе павышэнне сярэдняй заработнай платы працуючым у сферы матэрыяльнай вытворчасці ў 1,5—2 разы ў параўнанні з узроўнем 1990 года.

Дзяржкампрацы БССР сумесна з міністэрствамі і ведамствамі завяршыць работу па фарміраванню сістэмы мінімальных спажывецкіх бюджэтаў для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп насельніцтва. Зрабіць пераразлік вартасці спажывецкага кошыка, удакладніць узровень пражытачнага мінімуму. На іх аснове з улікам склаўшыхся цэн на тавары і паслугі вызначыць узровень мінімальнай заработнай платы, пенсій, дапамог, стыпендый, якія гарантуецца дзяржавай для адпаведных катэгорый грамадзян.

Да лістапада бягучага года распрацаваць новую рэспубліканскую тарыфную сістэму, якая б забяспечвала належны ўлік умоў і вынікаў працы, ліквідацыю залішніх міжгаліновых дыферэнцыяцый у яе аплаце.

Устанавіць, што тарыфныя стаўкі і аклады з'яўляюцца дзяржаўнымі гарантыямі і абавязковыя для прадпрыемстваў усіх форм уласнасці. Гэта тая мяжа, ніжэй якой аплата працы работнікаў не можа апускацца.

У бягучым годзе завяршыць ажыццяўленне мер па павышэнню заработнай платы работнікам, занятым у невытворчых галінах.

З пераходам на новыя тарыфныя стаўкі і аклады, якія ўключаюць кампенсацыйныя выплаты і праведзеную індэксацыю даходаў насельніцтва, звязаную з павышэннем рознічных цэн, увесці новы механізм індэксацыі. Даходы да 300 рублёў індэксуюцца ў размеры поўнай кампенсацыі росту цэн, а ад 301 да 600 рублёў — у размеры 0,5 працэнта за кожны працэнт росту цэн. Велічыня даходу, якая перавышае 600 рублёў, не індэксуецца.

Ажыццявіць меры, якія забяспечваюць эканамічна абгрунтаваныя суадносіны паміж расходам сродкаў на аплату працы і павелічэннем аб'ёмаў вытворчасці прадукцыі і паслуг, не дапускаючы апераджаючага росту фондаў спажывання прадпрыемстваў і арганізацый.

Нацыянальнаму банку БССР сумесна з камерцыйнымі банкамі пры выдачы сродкаў на заработную плату прад'яўляць павышаныя патрабаванні да прадпрыемстваў і арганізацый за забеспячэнне эфектыўнай работы.

У другой палове бягучага года падрыхтаваць прапановы па скарачэнню наяўнай грашовай масы шляхам прымянення насельніцтвам у разліках крэдытных, у тым ліку электронных, картак.

Дзяржкампрацы, Дзяржкамстату і Дзяржэканомплану БССР у тэрмін да 1 кастрычніка бягучага года распрацаваць і ўвесці ў дзеянне сістэму рэгулярнага інфармавання насельніцтва аб дынаміцы рознічных цэн і даходаў насельніцтва.

Ажыццяўляючы меры па падтрымцы жыццёвага ўзроўню пенсіянераў, да 1 кастрычніка 1991 года ўнесці на разгляд і зацвярджэнне Вярхоўнага Савета БССР праект Закона БССР «Аб пенсіённым забеспячэнні грамадзян у Беларускай ССР», прадугледзеўшы ў ім павышэнне мінімальных размераў пенсій па ўзросту і павелічэнне пенсій і дапамог інвалідам.

У мэтах сацыяльнай абароны малазабяспечаных непрацаздольных грамадзян распрацаваць дзяржаўную сістэму сацыяльных гарантый на рэспубліканскім і мясцовым узроўнях, якая прадугледжвае стварэнне мэтавых фондаў і рэзерваў тавараў першай неабходнасці, розныя віды натуральнай дапамогі, бясплатнае медыцынскае абслугоўванне, скідкі на аплату камунальна-бытавых паслуг, стварэнне цэнтраў сацыяльнай дапамогі і догляду.

Пачаць у 1992 годзе фарміраванне, разам з дзеючай, сістэмы асабістага пенсіённага і сацыяльнага страхавання.

Да канца бягучага года завяршыць распрацоўку сістэмы дыферэнцыраваных тарыфаў на спецыяльнае страхаванне ў залежнасці ад небяспекі, шкоднасці, цяжару работ і іншых фактараў умоў працы.

Праводзіць палітыку занятасці, якая папярэджвае масавае беспрацоўе. У першым паўгоддзі бягучага года завяршыць фарміраванне дзяржаўнай службы занятасці. Да канца бягучага года ажыццявіць распрацоўку праграмы занятасці насельніцтва з вызначэннем мер па збалансаванасці попыту і прапановы рабочай сілы на рынку працы, стварэнню дадатковых рабочых месцаў для сацыяльна неабароненых груп насельніцтва (моладзі, воінаў, якія звальняюцца ў запас, інвалідаў і іншых), арганізацыі грамадскіх работ.

У мэтах страхавання па беспрацоўю ўтварыць Дзяржаўны фонд садзейнічання занятасці.

Заканадаўча замацаваць формы прававога і эканамічнага рэгулявання рынку рабочай сілы, уключаючы пытанні ліквідацыі перашкод міграцыі, падатковыя і крэдытныя льготы пры стварэнні новых рабочых месцаў, мэтавага бюджэтнага фінансавання.

У мэтах павышэння эфектыўнасці работы і адказнасці спецыялістаў і кіраўнікоў усіх узроўняў, рабочых і служачых пашырыць практыку прымянення кантрактнай формы найму і аплаты працы.

Дзяржкампрацы БССР па ўзгадненню з Федэрацыяй прафсаюзаў Беларусі распрацаваць і зацвердзіць рэкамендацыі па заключэнню кантрактаў. Устанавіць, што кантракты з кіраўнікамі дзяржаўных прадпрыемстваў павінны быць заключаны да 1 ліпеня бягучага года. Кантракты з кіраўнікамі прадпрыемстваў саюзнага падпарадкавання заключаюцца пры ўдзеле рэспубліканскіх органаў кіравання.

Савету Міністраў БССР да 1 жніўня бягучага года ўнесці ў Вярхоўны Савет БССР прапановы аб змяненні Кодэкса законаў аб працы Беларускай ССР, а таксама праект Закона БССР «Аб калектыўных дагаворах і пагадненнях».

Устанавіць ільготы маладым грамадзянам і маладым сем'ям у выдзяленні зямельных участкаў для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва, прадастаўленні доўгатэрміновых крэдытаў на набыццё жылых дамоў і кватэр, уплаце ўступных паявых узносаў у жыллёва-будаўнічыя кааператывы, абзавядзенні хатняй гаспадаркай, набыцці прадметаў хатняга ўжытку працяглага карыстання і на іншыя мэты.

Вызначыць сістэму мер па сацыяльна-эканамічнай, арганізацыйнай, прававой падтрымцы прадпрымальніцкай дзейнасці маладых грамадзян, маладых сем'яў, якія аб'ядналіся для ажыццяўлення ўказанай дзейнасці калектываў маладых грамадзян.

У мэтах забеспячэння гарантый асабістай бяспекі грамадзян, іх уласнасці, грамадзянскіх правоў палепшыць дзейнасць праваахоўных органаў. Істотна ўзняць узровень работы службаў па барацьбе з эканамічным сабатажам.

Распрацаваць прапановы па ўнясенню паправак у Крымінальна-працэсуальны кодэкс БССР з мэтай увядзення практыкі грашовых узносаў за асабістае паручыцельства, аддачу абвінавачаных пад нагляд, аб павелічэнні спагнання за ўхіленне спецыялістаў ад выканання сваіх абавязкаў, ухіленне ад яўкі ў органы следства або суд.

СТАБІЛІЗАЦЫЙНЫЯ МЕРЫ Ў АСНОЎНЫХ СЕКТАРАХ ЭКАНОМІКІ

СПАЖЫВЕЦКІ КОМПЛЕКС

Забяспечыць безумоўнае выкананне ўстаноўленых на 1991 год заданняў Рэспубліканскай комплекснай праграмы развіцця вытворчасці тавараў народнага спажывання і сферы паслуг на 1991—1995 гады, штогадовы прырост аб'ёмаў нехарчовых тавараў на прадпрыемствах саюзнага падпарадкавання ў цэлым па рэспубліцы не менш чым на 10 працэнтаў, у тым ліку на неспецыялізаваных — на 15 працэнтаў.

Пачынаючы з 1992 года поўнасцю забяспечыць попыт насельніцтва рэспублікі на будаўнічыя матэрыялы для індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва.

Устанавіць, што ў 1991 годзе:

прадпрыемствы, якія забяспечылі вытворчасць і пастаўкі гандлюючым арганізацыям тавараў народнага спажывання (акрамя віна, лікёра-гарэлачных і тытунёвых вырабаў) звыш узроўню мінулага года, уносяць у бюджэт з атрыманых у выніку гэтага дадатковых сум прыбытку і падатку з абароту плацяжы па стаўках, паніжаных на 50 працэнтаў;

размяшчэнне, своечасовае і якаснае выкананне дзяржаўнага заказу на пастаўку тавараў стымулюецца зніжэннем да 5 працэнтаў сумы падатку на прыбытак;

увесь прырост вытворчасці нехарчовых тавараў застаецца ў распараджэнні мясцовых Саветаў і часткова можа быць накіраваны на задавальненне патрэб прадпрыемстваў.

Дзяржэканомплану БССР дадаткова прапрацаваць і ўключыць пры неабходнасці ў састаў дзяржаўнага заказу на 1991 год пастаўку асобных відаў жыццёва неабходных тавараў паўсядзённага попыту, звярнуўшы асаблівую ўвагу на забеспячэнне патрэб сельскага насельніцтва.

Вызначыць наменклатуру недарагіх нехарчовых тавараў для продажу насельніцтву рэспублікі і забяспечыць іх выпуск у неабходных аб'ёмах.

Пры распрацоўцы плана на 1992 год з улікам становішча, якое склалася на спажывецкім рынку, расшырыць наменклатуру дзяржаўнага заказу на пастаўку важнейшых відаў тавараў народнага спажывання.

Да прадпрыемстваў, якія неабгрунтавана адмаўляюцца ад прыняцця дзяржзаказу або выконваюць яго не ў поўным аб'ёме, прымяняць эканамічныя санкцыі.

У мэтах паляпшэння забеспячэння прадпрыемстваў неабходнай сыравінай, матэрыяламі і абсталяваннем за кошт абменных аперацый пакідаць у іх распараджэнні да 5—7 працэнтаў ад аб'ёмаў вытворчасці па вырабах лёгкай прамысловасці, да 10 працэнтаў — па таварах культурна-бытавога і гаспадарчага прызначэння.

Вызначыць да 1 жніўня бягучага года меры па забеспячэнню лёгкай прамысловасці ў 1992 годзе штучнымі і сінтэтычнымі ніткамі і валокнамі, тканінамі, ільновалакном і іншымі матэрыяламі, якія вырабляюцца ў рэспубліцы.

Вырабляемыя ў рэспубліцы гарбарную і футравую сыравіну, лён і іншыя віды рэсурсаў накіроўваць у першую чаргу на забеспячэнне прадпрыемстваў Мінлегпрома БССР, Белбытсаюза і Дзяржкампрома БССР на аснове доўгатэрміновых дагавораў, якія заключаюцца на ўзаемавыгадных умовах паміж прадпрыемствамі ўказаных міністэрстваў і ведамстваў і Мінсельгаспрода БССР.

Міністэрствам і ведамствам БССР, аблвыканкомам і Мінскаму гарвыканкому забяспечыць прыярытэтную пастаўку тавараў народнага спажывання ў рэгіёны краіны, якія пастаўляюць у рэспубліку сыравіну, матэрыялы, абсталяванне і камплектуючыя вырабы.

Па сыравіне і матэрыялах, якія паступаюць з-за межаў рэспублікі, ажыццявіць стварэнне сеткі сумесных прадпрыемстваў, а таксама выкарыстанне кааператыўных паставак замежных фірм для вытворчасці гатовых вырабаў на кампенсацыйнай аснове.

Паскорыць нарошчванне вытворчых магутнасцей па выпуску тавараў народнага спажывання за кошт будаўніцтва новых, рэканструкцыі і тэхнічнага пераўзбраення прадпрыемстваў.

Карэнным чынам перабудаваць сістэму арганізацыі гандлю, разглядаючы тут у якасці прыярытэтаў мэтанакіраваную і паслядоўную работу па перадачы ў калектыўнае і асабістае карыстанне грамадзян прадпрыемстваў рознічнага гандлю і грамадскага харчавання, удасканаленне дзейнасці спажывецкай кааперацыі па ўзмацненню яе ўплыву на фарміраванне спажывецкага рынку як на сяле, так і ў горадзе, развіццё магутнасцей падведамных прадпрыемстваў па нарыхтоўцы і перапрацоўцы сельскагаспадарчай сыравіны.

Устанавіць, што рознічны тавараабарот, даведзены абласцям і г. Мінску на 1991 год у агульным аб'ёме 32,87 млрд. рублёў, з'яўляецца дзяржаўным заказам і абавязковы для выканання ўсімі прадпрыемствамі і арганізацыямі міністэрстваў і ведамстваў, якія маюць гандлёвую сетку.

Забяспечыць комплекс дзейсных мер кантролю па ўсім ланцугу руху харчавання і прамысловых тавараў павышанага попыту ад вытворцаў і аптовых баз да спажыўцоў. Максімальна выкарыстоўваць правы і паўнамоцтвы, прадастаўленыя органам МУС БССР, КДБ БССР, Дзяржгандальінспекцыі БССР для барацьбы з безгаспадарчасцю, карупцыяй, спекуляцыяй, крадзяжамі і іншымі праяўленнямі эканамічных злачынстваў, звязаных, перш за ўсё, з дастаўкай тавараў і рэалізацыяй іх у рознічнай гандлёвай сетцы.

З мэтай змяншэння кошту грамадскага харчавання перагледзець катэгарыйнасць прадпрыемстваў і размеры нацэнак у агульнадаступнай сетцы, сталовых пры вытворчых прадпрыемствах, установах і навучальных установах.

Забараніць міністэрствам і ведамствам БССР, прадпрыемствам і арганізацыям, мясцовым Саветам народных дэпутатаў набываць за замежную валюту і па бартэрных здзелках легкавыя аўтамабілі, тэлевізары, магнітафоны і іншыя тавары не першай неабходнасці.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ДЗЯРЖАЎНАЯ ПРАГРАМА БЕЛАРУСКАЙ ССР ПА СТАБІЛІЗАЦЫІ ЭКАНОМІКІ І САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЕ НАСЕЛЬНІЦТВА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

АГРАПРАМЫСЛОВЫ КОМПЛЕКС

Кампенсаваць сельскагаспадарчым прадпрыемствам і арганізацыям у 1991 годзе дадатковыя затраты ў размеры 3 млрд. рублёў, у тым ліку ў сувязі з падаражэннем матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў, якія пастаўляюцца, работ і паслуг — 1930 млн. рублёў, павышэннем каштарыснай вартасці будаўніцтва ўводных аб'ектаў падрадным спосабам — 400 млн. рублёў, павышэннем заработнай платы ў эканамічна слабых гаспадарках (звыш кампенсацыі, звязанай з павышэннем рознічных цэн) у суме 501 млн. рублёў. Указаныя сродкі накіраваць на павышэнне закупачных цэн або іх індэксацыю на адзінку рэалізаванай сельскагаспадарчай прадукцыі ў 1991 годзе.

У гэтых мэтах утварыць у 1991 годзе часовы спецыяльны фонд фінансавай падтрымкі сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, арэндных калектываў, калгасаў, саўгасаў і іншых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў у размеры 2 млрд. рублёў. Устанавіць, што ў гэты фонд, пачынаючы з II квартала 1991 года, накіроўваецца 50 працэнтаў прыбытку дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый, атрыманага ў выніку перавышэння сярэднегаліновага ўзроўню рэнтабельнасці. Акрамя таго, выдзеліць у 1991 годзе на гэтыя мэты з бюджэту 1 млрд. рублёў.

Прадаставіць права Мінсельгаспроду БССР і аблсельгаспродам цэнтралізаваць па падпарадкаванасці да 30 працэнтаў прыбытку, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемстваў і арганізацый сістэмы (акрамя калгасаў і саўгасаў), уключаючы птушкафабрыкі, цяплічныя камбінаты і агароднінныя фабрыкі, зверасаўгасы.

Штомесячна пакрываць з бюджэту калгасам, саўгасам і іншым дзяржаўным сельскагаспадарчым стратным і нізкарэнтабельным прадпрыемствам расходы па выплаце мінімальных кампенсацый працуючым, звязаныя з павышэннем рознічных цэн. Далейшае павелічэнне заработнай платы работнікам сельскай гаспадаркі звыш кампенсацый з бюджэту ажыццяўляць за кошт сродкаў гаспадарак па меры паляпшэння іх фінансавага стану. У эканамічна слабых гаспадарках павышэнне заработнай платы ў 1991 годзе ажыццяўляць у межах сродкаў, якія выдзяляюцца на кампенсацыйныя выплаты.

Перапрацоўчыя прадпрыемствы аграпрамысловага комплексу выплачваюць падатак на прыбытак па льготнай стаўцы ў размеры 20 працэнтаў.

Устанавіць, што пачынаючы з другога паўгоддзя 1991 года розніца ў налічэнні сродкаў на сацыяльнае страхаванне (11 працэнтаў) у калгасах і саўгасах, якая накіроўвалася раней у бюджэт, застаецца ў іх распараджэнні.

Накіроўваць на патрэбы аграпрамысловага комплексу не менш паловы матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў рэспубліканскага фонду стабілізацыі рынку.

Міністэрствам, ведамствам БССР, аблвыканкомам і Мінскаму гарвыканкому да 1 ліпеня 1991 года арганізаваць заключэнне прамысловымі прадпрыемствамі і арганізацыямі з прадпрыемствамі аграпрамысловага комплексу на ўзаемавыгаднай аснове дагавораў аб кааперaванні іх матэрыяльных, працоўных і фінансавых рэсурсаў для ажыццяўлення будаўніцтва жывёлагадоўчых ферм, цяпліц, сховішчаў і іншых аб'ектаў, маючы на ўвазе атрыманую сельскагаспадарчую прадукцыю выкарыстоўваць для паляпшэння грамадскага харчавання і продажу рабочым і служачым.

На час правядзення зямельнай рэформы прадаставіць надзвычайныя паўнамоцтвы Камітэту па зямельнай рэформе і землеўпарадкаванню пры Савеце Міністраў БССР і яго органам на месцах па адабранню зямель, якія не выкарыстоўваюцца і нерацыянальна выкарыстоўваюцца, ва ўсіх землекарыстальнікаў і прадастаўленню іх грамадзянам для арганізацыі сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак, вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, індывідуальнага садаводства і агародніцтва, а таксама кааператывам грамадзян для калектыўнага садаводства і агародніцтва.

Прыватызацыю зямлі ажыццяўляць у першую чаргу ў калгасах і саўгасах, якія працуюць неэфектыўна. Пры гэтым не дапускаць прымусовага расфарміравання калгасаў і саўгасаў.

У прыярытэтным парадку накіроўваць у аграпрамысловы комплекс сыравінныя і матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы, неадкладна прыняць меры па павелічэнню аб'ёмаў дарожнага будаўніцтва ў калгасах і саўгасах, газіфікацыі сельскіх населеных пунктаў.

У рамках антыманапольных мер ажыццяўляць жорсткі кантроль за абгрунтаванасцю ўстанаўлення цэн прадпрыемствамі-манапалістамі, размешчанымі на тэрыторыі рэспублікі, якія пастаўляюць рэсурсы аграпрамысловаму комплексу.

Узмацніць матэрыяльную і адміністрацыйную адказнасць калгасаў, саўгасаў і перапрацоўчых прадпрыемстваў АПК за невыкананне даведзенага да іх на кантрактнай аснове дзяржаўнага заказу на пастаўку харчавання і сельскагаспадарчай сыравіны.

У мэтах садзейнічання развіццю сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак стварыць рэзервовы фонд трактароў, сельскагаспадарчай тэхнікі, камбікармоў, мінеральных угнаенняў, іншых матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў.

Для вырашэння найбольш важных праблем развіцця аграпрамысловага комплексу накіроўваць на яго патрэбы не менш 30 працэнтаў ствараемага рэспубліканскага валютнага фонду.

Паслядоўна павялічваць долю сельгаспрадукцыі, якая пастаўляецца на рынак і ў дзяржаўныя рэсурсы па дагаворных і свабодных цэнах.

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

З мэтай аслаблення крызісных працэсаў у прамысловасці і арыентацыі вытворчасці на задавальненне патрэб рэспублікі:

забяспечыць за кошт умацавання міжрэгіянальных сувязей, фонду стабілізацыі рынку, больш поўнага выкарыстання мясцовай сыравіны, матэрыялаў, адходаў вытворчасці і другасных рэсурсаў павышэнне ўзроўню вытворчасці і самазабяспечанасці рэспублікі (хімічнай, нафтахімічнай і лясной прамысловасці, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў) з тым, каб максімальна задаволіць патрэбнасці рэспублікі;

для прадухілення спынення вытворчасцей дазваляць прадпрыемствам ажыццяўляць тавараабменныя аперацыі, а таксама экспартныя пастаўкі па рэспубліканскіх ліцэнзіях часткі прадукцыі па бартэрных здзелках у абмен на неабходную сыравіну, матэрыялы і камплектуючыя вырабы;

Дзяржэканомплану БССР пры фарміраванні дзяржаўнага заказу на 1992 год для прадпрыемстваў базавых галін прадугледзець магчымасць самастойна рэалізоўваць па дагаворных цэнах часткі прадукцыі, якая вырабляецца;

за кошт далейшага развіцця ўнутрырэспубліканскіх кааперaваных сувязей, размяшчэння заказаў на прадпрыемствах рэспублікі, стварэння на кампенсацыйнай аснове вытворчых магутнасцей сумесна з іншымі рэспублікамі і замежнымі фірмамі забяспечыць вытворчасць камплектуючых вырабаў, сыравіны і матэрыялаў, якія ажыццяўляюцца на эканамічна нявыгадных умовах, ад нестабільных пастаўшчыкоў з-за межаў БССР і па імпарту;

сфарміраваць творчыя калектывы з вучоных і спецыялістаў і прыняць праграмы новы па стварэнню вытворчасці малатанажнай хіміі для вытворчасці тавараў, якія завозяцца па імпарту або з іншых рэспублік, некаторых дэфіцытных відаў вырабаў, змазачных масел, клею і іншых матэрыялаў;

дазволіць прадпрыемствам і арганізацыям прадугледжваць у сабекошце прадукцыі (работ, паслуг) затраты на фінансаванне агульнагаліновых і міжгаліновых навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ і мерапрыемстваў па асваенню новай прадукцыі.

Ускласці на кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў і мясцовыя Саветы народных дэпутатаў адказнасць за працаўладкаванне работнікаў, якія вызваляюцца ў выніку спаду або спынення вытворчасці. У гэтых мэтах [illegible] магутнасцей, якія не выкарыстоўваюцца, прадпрыемствы іншых форм уласнасці, малыя прадпрыемствы, сумесныя вытворчасці, перш за ўсё па выпуску тавараў народнага спажывання.

Для фарміравання структуры прамысловасці, арыентаванай у першую чаргу на задавальненне патрэб рэспублікі і не спажываецца рынку, пачынаючы з другога паўгоддзя бягучага года, прыступіць да этапнай канверсіі і перапрафілявання прадпрыемстваў абароннай прамысловасці, машынабудаўнічага і хімічнага комплексаў;

стварыць рэспубліканскі фонд садзейнічання канверсіі і перапрафіляванню за кошт бюджэтных асігнаванняў (уключаючы саюзныя), узносаў зацікаўленых прадпрыемстваў і арганізацый, 20 працэнтаў амартызацыйных адлічэнняў, што падлягаюць канверсіі і перапрафіляванню прадпрыемстваў [illegible], якія накіроўваюцца ў рэспубліканскі фонд для фінансавання рэспубліканскіх і рэгіянальных праграм.

Для прадпрыемстваў, якія ажыццяўляюць перапрафіляванне (рэспецыялізацыю), прадугледзець:

ільготнае падаткаабкладанне ў 1991 годзе прыбытку прадпрыемстваў, атрыманага ад выпуску новых відаў абсталявання для харчовай і лёгкай прамысловасці, гандлю і грамадскага харчавання, будаўнічага комплексу і вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, медыцынскай тэхнікі і прэпаратаў;

аказанне садзейнічання ў забеспячэнні матэрыяльна-тэхнічнымі рэсурсамі (уключаючы імпартныя), закупку імпартных тэхналогій, правядзенні работ па тэхнічнаму пераўзбраенню і рэканструкцыі.

На аснове рэалізацыі праграмы канверсіі і перапрафілявання, больш поўнага выкарыстання вытворчых магутнасцей, ушчыльнення эканамічнага заказу забяспечыць у 1991—1992 гадах прадпрыемствамі машынабудаўнічага і хімічнага комплексаў рэспублікі павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці тавараў народнага спажывання на адзін мільярд рублёў, абсталявання для перапрацоўчых галін АПК — у 1,7 раза, медыцынскай і рэабілітацыйнай тэхнікі — у 6,6 раза, разавых шпрыцоў, медыцынскіх вырабаў — у 1,4 раза, розных відаў абсталявання для выпуску будаўнічых матэрыялаў і будіндустрыі, будаўніча-дарожнай тэхнікі — на 250—300 млн. рублёў. Давесці долю грамадзянскай прадукцыі ў агульным аб'ёме вытворчасці прадпрыемстваў абаронных галін да 80 працэнтаў.

КАПІТАЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Засяродзіць фінансавыя, матэрыяльна-тэхнічныя і працоўныя рэсурсы на будаўніцтве аб'ектаў, звязаных з ліквідацыяй вынікаў чарнобыльскай катастрофы, аграпрамысловага комплексу, па выпуску тавараў народнага спажывання, прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, а таксама важнейшых аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры.

З улікам вынікаў праведзенай у 1 квартале 1991 года інвентарызацыі будоўляў прыняць рашэнне аб кансервацыі аб'ектаў, ажыццявіць меры па рацыянальнаму выкарыстанню будынкаў і збудаванняў на законсерваваных і прыпыненых будоўлях, прадугледзеўшы іх перапрафіляванне, здачу ў арэнду або бязвыплатную перадачу дзяржаўным арганізацыям.

Перагледзець праграмы капітальнага будаўніцтва ў калгасах, саўгасах і на іншых прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу на 1991 год і праекты гэтых праграм на 1992 год. Закансерваваць зноў пачынаемыя і пераходзячыя будоўлі вытворчага назначэння, якія маюць нізкі ўзровень будаўнічай гатоўнасці, жывёлагадоўчыя комплексы і новыя саўгасы на меліяраваных землях.

Стаўка падатку на прыбытак у другім паўгоддзі бягучага года па гатовай будаўнічай прадукцыі пры ўводзе ў эксплуатацыю ва ўстаноўленыя тэрміны аб'ектаў сацыяльнай сферы, па вытворчасці тавараў народнага спажывання і сценавых матэрыялаў, прадугледжаных дзяржаўнымі заказамі, памяншаецца на 20 працэнтаў.

Забяспечыць у бягучым годзе ўвод у дзеянне магутнасцей па вытворчасці 380 млн. штук сценавых матэрыялаў, у тым ліку ў аб'яднанні «Оршабудматэрыялы», на Бярозаўскім камбінаце будматэрыялаў, Петрыкаўскім заводзе дробных сценавых блокаў і на Бабруйскім камбінаце будматэрыялаў — па 80 млн. штук, у аб'яднанні «Гарыньбудматэрыялы» — 60 млн. штук умоўнай цэглы. Паскорыць асваенне магутнасцей, уведзеных у дзеянне ў 1990 годзе ў аб'яднаннях «Кераміка» і «Оршабудматэрыялы», на Бабруйскім і Любанскім камбінатах, і забяспечыць дадатковы выпуск на іх 80 млн. штук сценавых матэрыялаў.

Прадаставіць Савету Міністраў БССР на перыяд надзвычайных мер асобыя паўнамоцтвы прымаць рашэнні аб будаўніцтве аб'ектаў, неабходных для агульнарэспубліканскіх патрэб, без узгаднення з мясцовымі органамі ўлады (пры ўмове захавання эканамічных норм).

НАВУКА І САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫ КОМПЛЕКС

Для захавання навуковага патэнцыялу і стымулявання дзелавой актыўнасці ў навукова-тэхнічнай сферы аказваць максімум дзяржаўнай падтрымкі навуцы. Прадаставіць права навуковым арганізацыям самастойна ўстанаўліваць размер аплаты працы вучоных і спецыялістаў у залежнасці ад вынікаў іх работы і ў межах атрымліваемых даходаў.

Садзейнічаць развіццю прагрэсіўных інавацыйных структур, якія грунтуюцца на аб'яднанні навуковага і вытворчага патэнцыялу, арыентаваных на распрацоўку і асваенне навукаёмістых, рэсурсазберагальных тэхналогій і расшырэнне выпуску канкурэнтаздольнай, імпартазамяшчальнай прадукцыі.

Забяспечыць стварэнне ў рэспубліцы фондаў дзяржаўнай падтрымкі фундаментальных і прыкладных даследаванняў, садзейнічанне асваенню высокаэфектыўных вынаходстваў і ўвесці ў дзеянне ў 1991 годзе сістэму пастаянна дзеючай экспертызы навукова-тэхнічных праектаў, якія фінансуюцца з дзяржаўных крыніц. Для забеспячэння функцыянiравання рынку навукова-тэхнічнай прадукцыі і паслуг адкрыць да канца бягучага года рэспубліканскую біржу навукова-тэхнічных распрацовак і прыступіць да ўвядзення кантрактнай сістэмы арганізацыі навуковай дзейнасці, найму і аплаты працы навуковых работнікаў і спецыялістаў.

У мэтах падтрымкі нармальнага функцыяніравання сістэм народнай адукацыі, сацыяльнага забеспячэння, аховы здароўя і культуры ў рэспубліцы максімальна захаваць прадугледжаныя для гэтых мэт планам і бюджэтам аб'ёмы матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў, дабіваючыся іх эфектыўнага выкарыстання, магчымага скарачэння расходаў на непершачарговыя патрэбы.

З 1992 года пачаць пераход на нарматыўнае бюджэтнае планаванне ў разліку на аднаго жыхара па ахове здароўя, сацыяльнаму забеспячэнню, адукацыі, культуры, фізічнай культуры.

Захаваць дзяржзаказ на будаўніцтва аб'ектаў народнай адукацыі, культуры, сацыяльнага забеспячэння, лячэбных і архіўных устаноў, праваахоўных органаў.

На набыццё лякарстваў і медыцынскага інструментарыя ў мэтах падтрымкі ўзроўню забеспячэння імі лячэбных установаў рэспублікі выкарыстоўваць сродкі створанага рэспубліканскага валютнага фонду.

Пачаць падрыхтоўку і пераход да арганізацыі работы аховы здароўя на прынцыпах бюджэтна-страхавой медыцыны, увесці асабістае медыцынскае страхаванне з залічэннем сродкаў на асабістыя рахункі грамадзян.

Прыступіць да перапрафілявання дзеючых у рэспубліцы прадпрыемстваў Мінмедпрома на выпуск неабходных для насельніцтва рэспублікі лекавых сродкаў.

ЗНЕШНЕЭКАНАМІЧНЫЯ СУВЯЗІ

У мэтах больш эфектыўнага выкарыстання знешнеэканамічных сувязей:

Дзяржкамітэту БССР па знешніх эканамічных сувязях, Дзяржэканомплану БССР у чэрвені бягучага года завяршыць распрацоўку праграмы расшырэння экспарту канкурэнтаздольнай прадукцыі. Стварыць дадатковыя стымулы для экспарцёраў прадукцыі і прававую базу для развіцця знешніх сувязей;

Савету Міністраў БССР вырашыць пытанне аб утварэнні рэспубліканскага валютнага фонду, у тым ліку за кошт узгаднення з саюзнымі органамі змяншэння аб'ёмаў абавязковага продажу Знешэканомбанку СССР валютнай выручкі прадпрыемстваў рэспублікі і зніжэння нарматыву адлічэнняў у саюзна-рэспубліканскі валютны фонд.

Прадугледзець першачарговае выкарыстанне валютных сродкаў рэспублікі, уключаючы прыцягнутыя замежныя крэдыты, па наступных прыярытэтных напрамках:

перапрацоўка сельскагаспадарчай сыравіны і вытворчасць прадуктаў харчавання;

ліквідацыя вынікаў чарнобыльскай катастрофы;

развіццё будаўнічай індустрыі і вытворчасці будматэрыялаў;

вытворчасць тавараў народнага спажывання і медыкаментаў.

У мэтах памяншэння залежнасці рэспублікі ад паставак імпартнай сыравіны, матэрыялаў і шэрагу відаў тэхналагічнага абсталявання распрацаваць праграму развіцця імпартазамяшчальных вытворчасцей.

Асаблівую ўвагу ўдзяліць наладжванню эканамічных узаемаадносін на аснове новых форм супрацоўніцтва з краінамі Усходняй Еўропы.

Прадаставіць Дзяржкамітэту БССР па знешніх эканамічных сувязях права:

выдаваць ліцэнзіі і дазваляць прадпрыемствам ажыццяўляць экспартныя пастаўкі часткі прадукцыі па бартэрных здзелках у абмен на неабходную сыравіну, матэрыялы, камплектуючыя вырабы і тавары народнага спажывання;

выдаваць дазволы на правядзенне тавараабменных (бартэрных) аперацый па таварнай наменклатуры, якая вызначаецца рэспублікай;

ажыццяўляць кватаванне і ліцэнзаванне знешнеэканамічных здзелак.

У мэтах рэалізацыі задач па ўдасканаленню знешнеэканамічных сувязей, забеспячэння суверэннага права рэспублікі ў вырашэнні пытанняў таможна-тарыфнай палітыкі СССР вырашыць у другім паўгоддзі бягучага года пытанне аб удзеле Беларускай ССР у Таможна-Тарыфным Савеце.

Беларускаму ўпраўленню дзяржаўнага таможнага кантролю СССР аказваць усялякае садзейнічанне развіццю знешнеэканамічных сувязей. У гэтых мэтах забяспечыць збор поўнай і аб'ектыўнай таможнай статыстыкі, прызнанне і прымяненне рэспубліканскіх ліцэнзій па ўсяму перыметру адзінай эканамічнай прасторы СССР, інфармаванасць усіх удзельнікаў знешнеэканамічных сувязей па пытаннях таможнага заканадаўства, удасканальваць інфраструктуру таможнай службы на тэрыторыі БССР пры актыўным удзеле зацікаўленых міністэрстваў, ведамстваў, мясцовых органаў улады. Прапрацаваць пытанне аб увядзенні часовых таможных пошлін на асобныя віды харчовых тавараў і складанай бытавой тэхнікі, якія вывозяцца з рэспублікі.

ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ КІРАВАННЯ

Прадаставіць Прэзідыуму Вярхоўнага Савета БССР у перыяд паміж сесіямі права прыпыняць дзеянне заканадаўчых актаў і іх асобных артыкулаў, якія перашкаджаюць рэалізацыі мерапрыемстваў праграмы, а таксама прымаць пастановы нарматыўнага характару.

Прадаставіць Савету Міністраў БССР права рэгуляваць размяшчэнне заказаў на пастаўку прадукцыі для дзяржаўных патрэб на ўсіх прадпрыемствах і арганізацый рэспуб- знаходзяцца на тэрыторыі рэспублікі, незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці.

У мэтах павышэння выканальніцкай дысцыпліны і адказнасці прадаставіць Савету Міністраў БССР права ў парадку надзвычайных мер назначаць і змяшчаць з улікам рашэння Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР кіраўнікоў міністэрстваў і ведамстваў БССР, выканаўчых органаў улады (з давядзеннем да ведама адпаведных мясцовых Саветаў народных дэпутатаў), прадпрыемстваў і арганізацый рэспублікі, незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці, вызначаць меры адміністрацыйнага ўздзеяння за невыкананне дзяржаўных заказаў і дагаворных абавязацельстваў па пастаўках прадукцыі, а таксама іншых заданняў, якія закранаюць інтарэсы рэспублікі. У сувязі з гэтым прыпыніць на 1991—1992 гады дзеянне адпаведных заканадаўчых і нарматыўных актаў Беларускай ССР.

Савету Міністраў БССР унесці ў Вярхоўны Савет Беларускай ССР прапанову па пераліку дзеючых заканадаўчых і нарматыўных актаў, асобныя артыкулы і палажэнні якіх патрабуюць часовага прыпынення ў сувязі з рэалізацыяй праграмы.

Улічваючы, што ў цяперашніх умовах буйнамаштабная перабудова рэспубліканскіх органаў кіравання можа выклікаць далейшую дэзарганізацыю ў эканоміцы, у асноўным захаваць на дадзеным этапе іх арганізацыйныя структуры.

Для далейшага ўпарадкавання структуры дзяржаўнага кіравання да канца бягучага года падрыхтаваць новую Генеральную схему кіравання народнай гаспадаркай Беларускай ССР, якая адпавядае ўмовам пераходу да рынкавай эканомікі.

***

Для рэалізацыі гэтай праграмы неабходна дакладная работа ўсіх выканаўчых органаў улады. Яны і перш за ўсё іх кіраўнікі не павінны быць залежнымі ад палітычнай кан'юнктуры, надзейна абаронены ад праяўлення ўсякага роду экстрэмізму і націску. Адначасова яны павінны мець рэальныя магчымасці для спынення сабатажу і іншых дзеянняў, якія перашкаджаюць выкананню праграмных мерапрыемстваў.

Прапаноўваючы праграму стабілізацыі, Вярхоўны Савет і Савет Міністраў Беларускай ССР звяртаюцца за падтрымкай да Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, працоўных калектываў, да ўсіх палітычных партый, грамадскіх арганізацый і рухаў. Толькі кансалідацыя ўсіх сіл, якім дарагія інтарэсы народа, дазволіць дабіцца пералому да лепшага і не дапусціць скочвання рэспублікі ў бездань хаосу і разрухі.

Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Аб мерах па абароне эканамічных інтарэсаў Беларускай ССР пры вырашэнні пытанняў, звязаных з дзейнасцю прадпрыемстваў і арганізацый саюзнага падпарадкавання, размешчаных на тэрыторыі рэспублікі

У адпаведнасці з Законам Беларускай ССР «Аб асноўных прынцыпах народаўладдзя ў Беларускай ССР», улічваючы прапанову Савета Міністраў Беларускай ССР, у мэтах абароны маёмасных правоў і эканамічных інтарэсаў рэспублікі, прадастаўлення ўраду Беларускай ССР правоў па кіраванню прадпрыемствамі і арганізацыямі саюзнага падпарадкавання, размешчанымі на тэрыторыі рэспублікі, да фактычнай перадачы іх у яе ўласнасць, Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

1. Устанавіць, што ўсе прадпрыемствы і арганізацыі саюзнага падпарадкавання, размешчаныя на тэрыторыі рэспублікі, знаходзяцца пад юрысдыкцыяй Беларускай ССР.

2. Вызначыць, што змяненне статуса дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый саюзнага падпарадкавання, якія знаходзяцца на тэрыторыі рэспублікі, уступленне іх у састаў саюзных і міжрэспубліканскіх гаспадарчых асацыяцый, канцэрнаў і іншых аб'яднанняў праводзіцца толькі са згоды Савета Міністраў Беларускай ССР.

3. Устанавіць, што кантракты (дагаворы, пагадненні), якія заключаюцца з кіраўнікамі дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый саюзнага падпарадкавання, размешчаных на тэрыторыі рэспублікі, пры найме (назначэнні) без узгаднення кандыдатуры кіраўніка з Саветам Міністраў Беларускай ССР, несапраўдныя.

4. Рашэнні саюзных органаў аб раздзяржаўленні і прыватызацыі маёмасці дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый саюзнага падпарадкавання, размешчаных на тэрыторыі рэспублікі, прынятыя без узгаднення з Саветам Міністраў Беларускай ССР, не маюць юрыдычнай сілы і не падлягаюць выкананню.

Савету Міністраў Беларускай ССР разгледзець рашэнні саюзных органаў аб раздзяржаўленні і прыватызацыі маёмасці ўказаных прадпрыемстваў і арганізацый, прыпыніць выкананне тых з іх, якія ўшчамляюць інтарэсы Беларускай ССР.

5. Савету Міністраў Беларускай ССР вызначыць парадак урэгулявання фінансавых і іншых маёмасных узаемаадносін пры вырашэнні пытанняў перадачы прадпрыемстваў і арганізацый саюзнага падпарадкавання ва ўласнасць рэспублікі, іх раздзяржаўлення і прыватызацыі.

6. Абавязаць Савет Міністраў Беларускай ССР прыняць меры, якія забяспечваюць захаванне гаспадарчых сувязей, што склаліся, стабільную работу працоўных калектываў, улік патрэбнасці іншых рэгіёнаў у прадукцыі, якая вырабляецца ў Беларускай ССР.

7. Гэту Пастанову ўвесці ў дзеянне з моманту яе прыняцця.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР
М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

27 чэрвеня 1991 г. гор. Мінск.

Пастанова Вярхоўнага Савета Беларускай ССР

Аб Дзяржаўнай праграме Беларускай ССР па стабілізацыі эканомікі і сацыяльнай абароне насельніцтва

Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі **пастанаўляе:**

1. Зацвердзіць Дзяржаўную праграму Беларускай ССР па стабілізацыі эканомікі і сацыяльнай абароне насельніцтва.

2. Ураду Беларускай ССР, мясцовым Саветам народных дэпутатаў, прадпрыемствам і арганізацыям, грамадскім арганізацыям неадкладна прыступіць да рэалізацыі праграмы па стабілізацыі эканомікі і сацыяльнай абароне насельніцтва. Пастаянным камісіям Вярхоўнага Савета Беларускай ССР ажыццяўляць кантроль за ходам выканання гэтай праграмы.

3. Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Беларускай ССР вызначыць:

дадатковыя паўнамоцтвы урада, неабходныя для рэалізацыі стабілізацыйных мер у эканоміцы;

пералік актаў заканадаўства, дзеянне якіх часова прыпыняецца;

пералік першачарговых заканадаўчых актаў, неабходных для прававога забеспячэння рэалізацыі праграмы.

4. Абласным, гарадскім, раённым Саветам народных дэпутатаў забяспечыць актыўную работу мясцовых выканаўчых органаў, прадпрыемстваў, арганізацый у ажыццяўленні прынятых стабілізацыйных мер у эканоміцы і далейшай сацыяльнай абароне насельніцтва.

5. Ураду Беларускай ССР накіроўваць не менш 10 працэнтаў валютных сродкаў Савета Міністраў Беларускай ССР на набыццё лякарстваў і медыцынскага інструментарыя.

Старшыня Вярхоўнага Савета Беларускай ССР
М. ДЗЕМЯНЦЕЙ.

12 чэрвеня 1991 г. гор. Мінск.

Па слядах адной чуткі

Прыязджайце, Ніна Андрэева чакае вас!

Нашы ўважлівыя чытачы, безумоўна, не прапусцілі заметку ў «ФАКСе», у якой паведамлялася, што 13—14 ліпеня адбудзецца Усесаюзная канферэнцыя прыхільнікаў бальшавіцкай платформы ў КПСС, і аб'яднанне «Сталін» таксама атрымала запрашэнне за подпісам Ніны Андрэевай.

Ну і што, скажаце вы. Хай збірае на здароўе сваіх аднадумцаў Ніна Андрэева, хіба гэта пярэчыць закону? І я пагадзіўся б з Вамі, паважаны чытач, калі б не адно «але» — тое, што ленінградскі хімік чамусьці запрашае сваіх аднадумцаў у сталіцу суверэннай Беларусі.

Мы памятаем, як нікчэмна закончылася першае такое зборышча ў Адэсе: сталіністы былі выгнаны з горада. І тады ж Ніна Андрэева заявіла, што ў іх ёсць запасны варыянт: яны правядуць другі этап сваёй канферэнцыі ў Мінску.

Як бачым, план гэты ажыццяўляецца. Але хто на Беларусі падтрымаў ідэю правядзення канферэнцыі, хто заказваў памяшканні, месцы ў гасцініцах для дэлегатаў? У рэдакцыю паступіла інфармацыя, што заняцца гэтым было прапанавана рэспубліканскаму таварыству «Веды», аднак кіраўніцтва яго адмовілася ўдзельнічаць у такой палітычнай гульні. Мы звярнуліся за тлумачэннямі да першага намесніка старшыні таварыства «Веды» Леаніда Аляксандравіча Леўчука. Ён пагадзіўся адказаць на пытанні, але пачаў размову з невялікай заявы:

— Ва ўчарашнім матэрыяле аб рэгістрацыі ў Міністэрстве юстыцыі БССР грамадскіх аб'яднанняў «Народная газета» назвала нас Беларускім аддзяленнем Усесаюзнага таварыства «Веды». Дык вось, мы не з'яўляемся ніякім аддзяленнем, мы абсалютна самастойная арганізацыя, са сваім статусам, усімі неабходнымі атрыбутамі. Узаемаадносіны з саюзным таварыствам «Веды» будуюцца на дагаворных прынцыпах.

А цяпер наконт вашых пытанняў. Сапраўды, з боку аддзела ЦК КПБ па сувязях з грамадскімі арганізацыямі была такая прапанова. Нам паведамілі, што на Беларусь, а дакладней, да кіраўніцтва Кампартыі рэспублікі звярнулася з пісьмом Ніна Андрэева. Улічваючы блізкасць пазіцыі бальшавіцкай платформы ў КПСС, адным з кіраўнікоў якой яна з'яўляецца, і пазіцыі кіраўніцтва Кампартыі рэспублікі, што асабліва праявілася на красавіцкім пленуме ЦК КПСС, яна выказала просьбу дазволіць бальшавіцкай платформе правесці ў Мінску тэарэтычную канферэнцыю сваіх прыхільнікаў. Мелася на ўвазе запрасіць у наш горад чалавек 800—900 з усяго Саюза.

Пасля разгляду звароту Ніны Андрэевай нам было прапанавана вырашыць арганізацыйныя пытанні. Калі дакладней — мы павінны былі зрабіць заяву на залу, заняцца пытаннямі размяшчэння і транспартнага абслугоўвання ўдзельнікаў канферэнцыі.

Аднак мы не маглі пагадзіцца выконваць такое даручэнне. Мая пазіцыя, як і ў старшыні праўлення таварыства «Веды» Міхаіла Іванавіча Дземчука, прынцыповая: па-першае, правядзенне тых ці іншых мерапрыемстваў той ці іншай платформы ў КПСС — справа чыста ўнутрыпартыйная. Грамадскія арганізацыі тут ні пры чым. Па-другое, як член партыі, я катэгарычна не падзяляю пазіцыю Ніны Андрэевай і яе прыхільнікаў. Я лічу яе асобу адыёзнай, яе палітычны курс — гэта вяртанне да таталітарызму. Таму я адказаў, што як кіраўнік грамадскай арганізацыі, я не магу займацца справамі ўнутрыпартыйнымі, а як камуніст — прыносіць такімі дзеяннямі шкоду партыі.

Пасля было яшчэ некалькі спроб абавязаць нас уключыцца ў падрыхтоўку канферэнцыі. Аднак наша пазіцыя не змянілася. Мы разглядалі гэтае пытанне ў пярвічнай партыйнай арганізацыі таварыства, размаўлялі з кіраўніцтвам абласнога і гарадскога таварыства — калегі нас падтрымалі.

— Аднак канферэнцыя ўсё ж адбудзецца.

— Хутчэй за ўсё так. У Мінску ёсць, я так зразумеў, аддзяленне ўсесаюзнага руху «Адзінства», якое ў рэшце рэшт і стала хутчэй за ўсё ініцыятарам канферэнцыі. У панядзелак да мяне прыходзіў адзін выкладчык з Беларускага дзяржаўнага універсітэта Іван Аляксандравіч Міцькін, спрабаваў усё ж пераканаць, каб я, як афіцыйная асоба, аказаў садзеянне ў размяшчэнні ўдзельнікаў канферэнцыі ў гасцініцы Акадэміі навук БССР. Дыялог быў вельмі працяглы і цяжкі. Але закончыўся ён безвынікова.

— Леанід Аляксандравіч, а чаму менавіта таварыству «Веды» было прапанавана займацца падрыхтоўкай канферэнцыі?

— Я і сам задаваў такое пытанне. А мне адказваюць: «Из тактических соображений»! Партыйныя камітэты застаюцца ў цяні, ведаючы, якой адыёзнай фігурай з'яўляецца Ніна Андрэева, а падстаўляюць пад удар грамадскую арганізацыю, якая зусім ніякіх адносін да гэтай платформы не мае.

Перакананы, што сувязямі з нінаандрэеўскім рухам рэспублікі партыя толькі кампраметуе сябе?

Што ж, прыемна адчуваць, як нарэшце і грамадскія арганізацыі паступова становяцца незалежнымі. Гэта трэба толькі вітаць. Але дзе ж ініцыятары канферэнцыі? Мы паспрабавалі знайсці членаў «Адзінства» ва універсітэце. Аднак там пра гэта аб'яднанне нічога не чулі. Не змаглі (ці не захацелі?) дапамагчы і журналісты, якія праславіліся ідэнтычнасцю сваіх позіркаў нінаандрэеўскім. У ЦК КПБ, на жаль, таксама канкрэтна нічога не ведаюць, (Эдуард Марцінавіч Скобелеў, напрыклад, сказаў, што яму білет на канферэнцыю абяцалі, але хто арганізатар — не вядома).

Такім чынам, расследаванне закончылася на тым жа, як і пачалося: у наступныя суботу і нядзелю ў Мінску (хутчэй за ўсё ў грамадска-палітычным цэнтры абкама партыі) адбудзецца другі этап Усесаюзнай канферэнцыі бальшавіцкай платформы ў КПСС. Прыязджайце, таварышы, Ніна Андрэева чакае вас!

Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ,
аглядальнік
«Народнай газеты».

Народная газета

Зарубежье

ТАСС ● ИАН ● Инфоновости ● «Народная газета»

Адмирал Того вновь «на коне»

До второй мировой войны адмирал Хэйхатиро Того, нанесший поражение Российскому флоту в Цусимском сражении (1905 г.), слыл у японцев «Богом войны». Его имя широко использовалось милитаристской и националистической пропагандой, поэтому после капитуляции Японии все упоминания о Того из учебников по истории были исключены. В новых учебниках для начальной школы, которые выйдут в следующем году, для описания деяний «смелого флотоводца-новатора» вновь нашлось место в соответствии с рекомендацией министерства просвещения обучать ребят в основном на примерах из «Жизни и деятельности отдельных личностей». Многие японские учителя в этой связи выражают опасения в том, что новый «дебют» адмирала будет воспринят как элемент возрождения японского милитаризма.

Польша сегодня

3. «Загнивающими» стать непросто...

У неизбалованного советского человека голова идет кругом от увиденного в Польше. Как будто вся страна превратилась в огромный базар. Продают все, всё и везде. Трудно поверить, что может быть столько разных товаров. Похоже, супермаркеты всех западноевропейских стран открыли здесь свои неистощимые филиалы. Рынки завалены овощами и фруктами, среди сотен предлагаемых образцов одежды не найдешь двух одинаковых. Одним словом иллюзия невиданного прежде изобилия. Однако этот товарный рай доступен не всем. Бывшим гражданам социалистического государства предстоит пройти краткий курс капитализма. Нерадивые ученики рискуют остаться на обочине жизни.

По замыслу авторов экономической реформы, каждый поляк должен стать хозяином-собственником. На это рассчитан план приватизации государственного имущества, который существенно отличается от чешской или венгерской концепций.

Каждый поляк получит часть государственного имущества совершенно бесплатно в виде бонов. Однако за эти боны он не сможет купить акции, как это делается в соседней Чехо-Словакии. Предоставляется право лишь инвестировать свои боны в один из нескольких специальных приватизационных фондов, первые из которых предполагается открыть нынешней осенью. Эти фонды послужат основой для создания атрибутов капиталистической экономики — инвестиционных банков, фондов капитала риска (который вкладывается в новые, еще не зарегистрированные на бирже фирмы), аудиторских и консультационных фирм и т. д. Это должно привести в первую очередь к созданию рынка капитала—краеугольного камня экономики.

На первых порах одна треть имущества 100 крупнейших предприятий будет разделена между владельцами бонов через посредничество приватизационных фондов. Они смогут поменять определенный им капитал на другие пакеты акций, а также покупать за боны акции других государственных предприятий. Зарплата менеджеров того или иного фонда будет зависеть от их умения удачно вкладывать средства. Чем выгоднее сделка, тем больше причитается менеджеру. Капитал начнет активно работать, появятся зарубежные покупатели акций.

Со временем непосредственные владельцы бонов смогут распоряжаться своей частью капитала по собственному разумению: обменивать, продавать, покупать акции фондов. Одновременно будет действовать биржа ценных бумаг, проводящая операции за наличные.

Может быть, поляки и правы, подходя к приватизации таким путем. Ведь действительно, люди, получившие боны впервые в жизни, не могут быть квалифицированными инвесторами, не обладают информацией о положении дел в той или иной отрасли, куда они хотели бы вложить свой капитал. Потому поначалу этим займутся профессионалы.

Разделение имущества государственных предприятий между множеством владельцев вряд ли побудит администрацию к улучшению работы, и многие предприятия рискуют обанкротиться. Кроме того, западные бизнесмены не рискнут вкладывать деньги в фирму, где несколько тысяч равноправных владельцев. Хозяин должен иметь хотя бы контрольный пакет акций, чтобы влиять на положение дел.

Разумеется, поляки не застрахованы от недобросовестных манипуляций профессионалов с их бонами, однако риск представляется оправданным. Не надо забывать и о том, что разделение государственного имущества не означает автоматического увеличения богатства граждан. Ведь большинство предприятий (а приватизации ждут около 7 тысяч) не имеют рыночной ценности в технологически развитой Европе. Основные фонды могут оказаться грудой металлолома. В некоторых случаях дешевле основать новое предприятие, чем пытаться вдохнуть жизнь в одряхлевшую технику.

Искусству обращения с капиталом полякам еще предстоит научиться. 40 работников уже приватизированных банков, главным образом председатели и директора, выехали в Соединенные Штаты Америки для обучения в престижной школе управления при университете Норт-Вейерн вблизи Чикаго. Программа сотрудничества предусматривает выезд американских преподавателей в Польшу для обучения банковских работников среднего звена.

Раньше думали, что стоит появиться за спиной работника нескольким желающим занять его место, как он автоматически начнет трудиться на порядок лучше. Сегодня в Польше уже 1,5 миллиона безработных, к концу года ожидается два миллиона, но...

— Парадокс в том, что работать лучше никто не стал, — говорит бизнесмен Роман Колодзейчак из Прокопува. — Более того, невозможно найти домработницу даже за неплохую плату. А где найти пенсионера, чтобы охранял ночью машины на улице? Нет желающих! Девушка за мытье нескольких окон требует миллион злотых. Работодатели ищут специалистов, учеников, а бюро по трудоустройству переполнено клиентами. Главным образом приходят за пособием. Получат там несколько сотен тысяч—и прямиком на базар. Так им идет трудовой стаж и выслуга лет (регистрация безработного это гарантирует), а здесь, на рынке, плывут денежки.

Во многом этому способствуют наши соотечественники. Каждый день до сотни туристических автобусов пересекают советско-польскую границу. Туристы выходного дня уже давным-давно не интересуются ни историей, ни культурой сопредельного государства. Весь их интерес умещается в пределах Дворца культуры и науки в Варшаве, построенного в стиле сталинской архитектуры. Великий вождь наверняка перевернулся бы в гробу, увидев такую бездну своих соотечественников, униженно стоящих вдоль парковых аллей над развернутыми газетками с товаром и взывающих:

— Прошэ пана покупиць бардзо танно!

Разумеется, наш товар никто бы и брать не стал по здешней цене, если бы не «бардзо танно». Дождавшись конца дня, когда советским туристам пора собираться на родину, перекупщики-безработные скупают у них все оптом, а потом спокойно перепродают приобретенное в удаленных от советских рубежей городах в два-три раза дороже, безо всяких усилий получая на рынке прибыль, равную среднемесячной зарплате. Плюс еще пособие.

Однако, надо полагать, польский парадокс долго не продлится. Из пустого сосуда не нальешь. Можно еще какое-то время продавать и перепродавать, но главное—производить. Возникающие новые фирмы в основном торгово-посреднические. Западные товары подавили продукцию местных предприятий.

Еще многие работники госпредприятий живут по старому принципу: «Чы стой, чы лежы —якась пенсия належы», что близко по смыслу нашему «лучше за рубль лежать, чем за сто бежать».

Руководитель Варшавского районного бюро труда Тереза Попель подтверждает:

— Среди безработных самое большее одна треть — люди, ищущие работу. Есть группа людей, которым выгодно получать пособие и ожидать чуда—работы по своему желанию и амбициям.

— Не для того училась на манекенщицу, чтобы торчать за прилавком, — отказывалась от предложенного места молодая девушка.

— Не могу работать в той фирме, куда вы меня направили, — объяснялась другая. — Они меня самым настоящим образом эксплуатируют. Ни выскочить за покупками, ни поговорить по телефону.

Многие тянут волынку с трудоустройством возможно дольше. Приносят справки от врачей, что предлагаемая работа им противопоказана, и т. д. Любопытно, что во время недавней забастовки автотранспортников в Варшаве именно они подъезжали к бюро на такси, а зарабатывающие по полтора миллиона злотых в месяц предпочитали идти к месту работы пешком за несколько километров.

— Теперь у нас зарегистрировано около 20 тысяч безработных из Варшавы и ближайших окрестностей, — продолжает Тереза. — Более 15 тысяч из них со средним и высшим образованием. Располагаем же мы 7 тысячами рабочих мест. 6 тысяч из них для рабочих.

Растет безработица в Лодзи и других городах. Требуется система переобучения, переквалификации, но...

— Пока уровень борьбы с безработицей у нас такой, как и уровень капитализма, — заключает Тереза с горькой усмешкой.

Разорительная арендная плата за производственные помещения достигает иногда нескольких миллионов злотых за 1 квадратный метр. Первыми сдаются мелкие предприниматели. С прошлой осени в Кракове закрылось 3665 фирм, то есть почти пятая часть зарегистрированных. Капитализм пожирает своих детей.

Иван ГЕРАСЮК,
обозреватель «Народной газеты».
(Окончание следует.)

З глыбіні стагоддзяў



Дзе ты, чароўная папараць-кветка?



Такім чынам, у ноч з 6 на 7 ліпеня — Купалле (Купала, Ян, Іван), а на Русі — свята Іаана Прадцечы. Калі кульмінацыяй зімовых падзей былі ў народным жыцці Каляды, то адпаведным па значнасці святам улетку было Купалле, якое адзначалася дзень у дзень праз паўгода. Напярэдадні яго дзяўчаты збіралі кветкі на вянкі, рабілі запасы лекавых раслін ад рознай немачы.

Асаблівую ўрачыстасць святу надавала купальскае вогнішча. Дзяўчаты і хлопцы з усёй вёскі сцягвалі розную старызну, а таксама трэцкі ссохлы «май» і вывозілі ўсё гэта за сяло, дзе меркавалася гулянне. Туды ж увечары накіроўваліся вяскоўцы з купальскімі песнямі. Агонь для вогнішча здабывалі ад трэння драўляных брускоў. Як сімвал сонца ўздымалі на шасце запаленае кола. Полымя купальскага вогнішча надзялялася ачышчальнай сілай, хлопцы і дзяўчаты скакалі цераз яго. Моладзь забаўлялася гульнямі, варажбою, вадзіла карагоды, спявала песні.

З Купаллем звязана адна з самых рамантычных легенд беларускага народа пра папараць-кветку. Верылі, што ў купальскую ноч на папараць сыходзіць агонь Пяруна і яна ўспыхвае бэзавай кветкай, цвіце апоўначы некалькі імгненняў, і трэба паспець ухапіць яе. «Хто гэту кветку здабудзе, будзе мець усё, чаго толькі яго душа пажадае»: «...можна тады ведаць усё, што на свеце робіцца». Недасягальнасць папараці-кветкі ў беднага чалавека атаясамлівалася з багаццем, з закапанымі немаведама кім і калі скарбамі, якія ў гэту ноч выходзяць на паверхню прасушыцца. Скарбы, якія ахоўваюцца нячысцікамі, могуць даццца ў рукі толькі ўладальніку папараці-кветкі. У паданнях расказвалася, што ў купальскую ноч расліны размаўляюць між сабою, дрэвы пераходзяць з месца на месца, а рэкі свецяцца прывідным святлом. Сярод цудаў купальскай ночы называлі разгул розных чараўнікоў і ведзьмаў, якія ўсяляк шкодзяць людзям — заездзжваюць коней і адбіраюць малако ў кароў. Каб не падпусціць нячыстую сілу, над парогамі хлявоў і хат вешалі прадметы, якімі ведзьма магла парэзацца, пакалоцца, апячыся: сярпы, іголкі, крапіву.

Вельмі пашыранай на купальскім свяце была варажба. Дзяўчаты і хлопцы загадвалі, што чакае іх у будучыні. Па кінутых на ваду папарна вянках сачылі, сыйдуцца яны ці, наадварот, разыдуцца: можа, чый вянок не будзе падхоплены плынню, а прыстане ці нават патоне. Сабраныя на Яна галінкі купалкі з нераспушчанымі кветкамі прыносілі ў хату, утыкалі за абразы, у шчыліны між бярвёнамі ці за бэлькі. Калі кветкі распускаліся, гэта значыла, што дзяўчына выйдзе замуж альбо задуманае ёю збудзецца.

Пад раніцу моладзь купалася ў рацэ, качалася па купальскай расе, сустракала ўсход сонца, у гонар якога некалі і святкавалася Купалле. Кажуць, што на купальскую зару сонца «іграе» — дваіцца, траіцца і пераліваецца рознымі колерамі.

Уладзімір ВАСІЛЕВІЧ.
Фота Сяргея БРУШКО.

Увага!

На хвалі «Купальскай ночы»

Упершыню ў беларускім эфіры ў ноч на Івана Купалу — з 6 на 7 ліпеня — радыёстанцыя «Беларуская маладзёжная» ладзіць шасцігадзінны марафон «Купальская ноч».

З 19.00 і да гадзіны ночы ў прамым эфіры — вядомыя дзеячы беларускага Адраджэння, мастакі, паэты, музыкі, народныя майстры, людзі, што складаюць, як гаворыцца, «залаты фонд» нацыі. Перасовачныя студыі злучаць радыёдом на вуліцы Чырвонай у Мінску з месцамі правядзення купальскіх святаў у розных кутках Беларусі. Прамыя тэлефоны гарантуюць удзел у марафоне шматлікім слухачам. Не абыдзецца, вядома, без прысутнасці ведзьмакоў, русалак ды іншай «чартаўшчынкі».

Згодна з паганскімі ўяўленнямі, купальскае свята — час найвышэйшага росквіту Зямлі і людзей, еднасці ўсяго жывога.

Па задуме арганізатараў радыёмарафона чарадзейнай папараць-кветкай, узгадаванай з дапамогай будучых дабрачынных спонсараў і мецэнатаў, павінен стаць збор сродкаў на стварэнне першага на Беларусі нацыянальнага мастацкага ліцэя ў Мінску. Арганізацыі, прадпрыемствы, кааператывы, асобныя грамадзяне змогуць паведаміць пра свае ахвяраванні прама ў эфіры. Разліковы рахунак, на які можна пералічыць грошы: 142221 у Маскоўскім аддзяленні Мінскбізнесбанка, з паметкай «Цэнтральнае РАНА, школа № 26», МФО 400042.

Запрашаем стаць нашымі партнёрамі ў высакароднай справе. 1 — да сустрэчы на хвалі «Купальскай ночы»!

Віталь КАНСТАНЦІНОВІЧ.

ШАШКИ

Концовка Д. Сухорукова

Белые: пр. a1, a3, c5, e5, g1, h6 (6).

Черные: пр. a5, c3, d8, f8, g3, g7 (6).

Белые выигрывают

Предлагаем вниманию читателей концовку, составленную минским проблемистом Дмитрием Сухоруковым. Свои решения присылайте по адресу: **220010, Минск, Дом правительства, комн. 369, редакция «Народной газеты. «Шашки».**

Осторожно, «Косяк»!

Дебютная теория в шашках имеет первостепенное значение. Известны варианты, в которых уже после второго хода теоретически доказано, что одна из сторон не может избежать поражения. Сегодня мы знакомим любителей игры с одним из популярных дебютов, получившим название «Косяк», в котором соперники в начальной стадии придерживаются флангового развития.

1. cb4 fg5 2. gf4 gf6 3. bc3 bc5 4. cd4 gh4 5. db6 ac5 6. dc3. Белые подтягивают силы для атаки ослабленного правого фланга. 6...fe5 7. cd2 eg3 8. hf4 hg7? Естественный ход, который, однако, является непоправимой ошибкой. Следовало играть 8 ...ef6. 9. ab2 ef6 (нельзя 9 ...gf6 или 9 ...cb6 ввиду 10. fg3) 10. fg5 hf4 11. ee7 df6 12. de3 fe7. Нетрудно убедиться, что ничего лучшего у черных уже нет. 13. ef4 fe5. **В этой позиции белые проводят комбинацию, впервые осуществленную известным русским шашистом Д. Саргиным еще в 1891 году. Попробуйте найти ее самостоятельно.**



Сами с усами?

Хочу получить водительское удостоверение, но попасть в группы ДОСААФ по подготовке водителей непросто — большие очереди. Слышал, что можно сдавать экзамены в ГАИ экстерном, после самостоятельной подготовки...

Сергей МАКОВСКИЙ.
г. Минск.



В отделе технического надзора УГАИ БССР подтвердили возможность самостоятельной подготовки кандидатов в водители и сдачи экзаменов экстерном. Но это разрешено только в тех городах, где есть очередь на запись в группы ДОСААФ. Нововведение действует в этом году и лишь для лиц с высшим техническим образованием (или средним, но при наличии технических навыков). Желающие сдавать экзамены в ГАИ экстерном должны уплатить 63 рубля и прослушать 8 часов консультаций. Затем — неделя самоподготовки и вызов на экзамен. Для успешной сдачи экзаменов даются три попытки (каждая пересдача — 1 руб. 5 коп.). Провалившийся после третьей попытки допускается к последующей сдаче экзаменов лишь после прохождения курса обучения в группах ДОСААФ.

Сколько чего можно везти?

Лето — пора путешествий дальних поездок. Хотелось бы, чтобы газета еще раз уточнила нормы вывоза за пределы республики продовольственных товаров.

Регина УЛАСЕВИЧ.
г. Гродно.

Как нам сообщили в Министерстве внутренних дел БССР, во исполнение Закона «О временных мерах по защите потребительского рынка Белорусской ССР» определено, что за пределы республики допускается вывоз (пересылка) нижеперечисленных товаров по нормам:

хлебобулочные изделия	— 2 кг
масло (маргарин, жир)	— 0,4 кг
сыры сычужные твердые	— 0,3 кг
сыры мягкие плавленные	— 0,5 кг
другие молочные продукты	— 1,5 кг
сахар	— 1 кг
конфеты (развесные и в коробках)	— 0,5 кг
мучные кондитерские изделия	— 1 кг
молочные консервы	— 2 банки
рыбные консервы	— 2 банки
табачные изделия	— 5 пачек
колбасные изделия	— 0,5 кг
овощные и фруктовые консервы (включая соки)	— 3 литра
яйца	— 10 шт.
вино-водочные изделия	— 2 бут.
пиво	— 5 бут.
безалкогольные напитки и минеральные воды	— 5 бут.
спички	— 10 кор.

Выпьем и снова... нальем ли?

